# СВАБОДА

№18(33), 31 ЖНІЎНЯ 2006 г.


# ДОМ ЛІТАРАТАРА ПЕРАТВОРАНЫ Ў КАБАК

## ЧАМУ ЛІКВІДУЕЦЦА НАЙСТАРЭЙШАЯ ТВОРЧАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСІ?

Гісторыя з высяленнем Саюза беларускіх пісьменнікаў з Дома літаратара ў Мінску цягнецца ўжо некалькі гадоў і сёння набліжаецца да лагічнага завяршэння. Няма сумневу, што наступным крокам у змаганні прэзідэнта з пісьменнікамі стане ліквідацыя Саюза на падставе страты юрыдычнага адраса.

У чым логіка гэтай барацьбы, у чым яе сэнс і рацыянальнае зерне, а ўрэшце – у чым карысць ад ліквідацыі найстарэйшай творчай арганізацыі Беларусі?

### НЕ ЎКРАДЗІ...

Беларуская літаратура ад пачатку была і застаецца галоўным нацыятворчым фактарам. Менавіта з мастацкага слова пачынаецца ўсведамленне чалавека сябе беларусам. “Мой родны кут, як ты мне мілы...” – гэта ведаюць усе калі не з пялёнак, дык са школы. Беларускія літаратары – Багушэвіч, Купала, Колас, Багдановіч, Караткевіч – галоўныя нацыянальныя аўтарытэты і стваральнікі нацыянальнай ідэі, на творах якіх выхоўваюцца новыя пакаленні беларусаў. У дзяцінстве ў нас мала хто не спрабуе пісаць вершы. Адсюль і вызначэнне беларусаў як нацыі паэтаў.



**Высяленне Саюза** *беларускіх пісьменнікаў з Дома літаратараў. Мінск, 30 жніўня 2006 году.*

Трагічны быў лёс многіх літаратараў, але ўсведамленне нацыятворчае ролі літаратуры было ўласцівае кожнаму палітычнаму рэжыму ў Беларусі. Асаблівае месца ў грамадстве Саюз пісьменнікаў займаў і пры Машэраве. Будынак на вуліцы Фрунзэ, 5 трыццаць гадоў назад будаваўся менавіта як Дом літа-

► СТАР.4

## КЕПСКАЯ ПРЫКМЕТА:
### ДЗЯРЖАВА ЗНОЎ АБЯЦАЕ ТАННЫЯ КВАТЭРЫ

► СТАР.5

## БУДЫНКІ — ЛІКВІДАВАЦЬ! ЛЮДЗЕЙ — АДСЯЛІЦЬ!

► СТАР.6

kamunikat.org

# НАВОШТА ЛУКАШЭНКА АДБІРАЕ Ў ПІСЬМЕННІКАЎ ДОМ ЛІТАРАТАРА?

**МАРК, ВЫКЛАДЧЫК ВНУ:**

## “КАБ ПІСЬМЕННІКАЎ НЕ БЫЛО”

Дом літаратара ні пры чым. Ён проста хоча, каб іх не было, пісьменнікаў. Бо любы культурны чалавек – гэта патэнцыйны вораг Лукашэнкі. Робіць ён нешта, ці не робіць, культурны чалавек раздражняе Лукашэнку самім сваім існаваннем. Не дачапіліся б да пісьменнікаў, дачапіліся б яшчэ да каго-небудзь.

**АЛЯКСАНДР КУЛІНКОВІЧ, ЛІДЭР РОК-ГУРТА “НЕЙРА ДЗЮБЕЛЬ”:**

## “ПРОСТА ДАЙШЛА ЧАРГА”

Ні з-за чаго. Проста дайшла чарга. У нашай краіне трэба ўвесь час кагосьці выганяць, забараняць. І вось настала чарга пісьменнікаў. Гэта планавае высяленне. Як дом планава зносяць, так планава і высяляюць. Я апошнім часам логікі ў нашай улады ніякай не бачу.

**СЯРГЕЙ, ПЕНСІЯНЕР:**

## “УСЯ СПРАВА Ў МАЁМАСЦІ”

Уся справа ў маёмасці. Мой былы НДІ, якому я аддаў трыццаць гадоў, здае свае плошчы за 10 баксаў за метр. А колькі можа каштаваць метр у цэнтры горада? І плюс сама гэтая арганізацыя яго раздражняла.

**ЗІНАІДА БАНДАРЭНКА, НАРОДНАЯ АРТЫСТКА БЕЛАРУСІ:**

## “ЁН ІМКНЕЦЦА ДА ПОЎНАГА КАНТРОЛЮ

Зразумела, чаму. Ён зараз зачыняе і знішчае ўсё, што жывое. Не хоча, каб была хоць якая альтэрнатыва. Ва ўсім. Ён імкнецца да поўнага кантролю. І людзі настолькі прызвычаіліся... Ёсць у нас такая рыса характару – празмерная цярплівасць. Людзі нават не рэагуюць ужо. І невядома, што будзе далей. Вынішчаецца любое іншадумства. Усё павінна быць дзяржаўнае, толькі чыноўнае. Каб людзі залежалі ад аднаго чалавека. А тут засталося пісьменніцкае суквецце. Ну, як яго можна трываць?

**КАЦЯРЫНА, БІБЛІЯТЭКАРКА:**

## “ВЫЗВАЛЯЕ МЕСЦА ДЛЯ СВАЙГО САЮЗА”

Ён вызваляе месца для свайго саюза. Туды пераселіцца Чаргінец і кампанія. Вось толькі хто будзе да іх хадзіць? Каму яны патрэбны?

**ВАЛЕР БУЛГАКАЎ, ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР ЧАСОПІСА “АРХЭ”:**

## “З-ЗА КАЗУЛІНА”

Яны не ўпісваюцца ў ідэалагічны ранжыр цяперашняй улады. Гэта значыць, улада доўгі час спрабавала знайсці супольную мову. А пісьменніцкая арганізацыя, нягледзячы на ўсе тэндэнцыі, якія існавалі і існуюць у ёй, усё ж дэманстравала незалежнасць і самастойнасць. Думаю, што крытычным момантам, які паўплываў на цяперашнія падзеі, былі прэзідэнцкія выбары 2006 году. Ніхто ж не хаваў, што пісьменніцкая арганізацыя выказвалася, прапагандавала і стаяла поплеч з Аляксандрам Казуліным. Казулін быў, як паказалі далейшыя падзеі, нават большым раздражняльнікам, чым Мілінкевіч. І невыпадкова ён атрымаў вельмі сур’ёзны прысуд. Думаю, што ў вачах цяперашняй улады пісьменнікі – гэта здраднікі, якія падрываюць знутры адзінства беларускай нацыі. Таму ім не месца ў самым сэрцы беларускай сталіцы.

**КАНСТАНЦІН, МЕНЕДЖЭР:**

## “КАБ ЁН САЧЫЎ ЗА ГЭТЫМ, ІХ БЫ ВЫГНАЛІ ЗА ПЯЦЬ ХВІЛІН”

А я не думаю, што гэта ён сам робіць. Я не думаю, што яму кожны дзень дакладаюць: выгналі пісьменнікаў ці не. Калі б ён трымаў гэтае пытанне на кантролі, іх бы выгналі за пяць хвілін. А вось уся гэтая біялогія, пад яго сфармаваная, усё, што на яе не падобнае, пачынае пажыраць. Такая паганая плесня. Усё, што не смярдзючае і не зялёнае, усё гэта трэба зжэрці. Каб яно таксама пазелянела і засмярдзела. Прырода ў гэтай плесні такая.

**АЛЕСЬ ПЕТРАШКЕВІЧ, ДРАМАТУРГ:**

## “З ГЭТЫМІ ДВУМА ПАКОЯМІ МЫ НЕ ГУБЛЯЕМ САЮЗ”

Бальшыня пісьменнікаў ва ўнутранай эміграцыі. І літаратура ўсё роўна будзе. Пісьменнікі, а іх каля 500 чалавек, гэта батальён. Ён не патрэбны нашаму прэзідэнту. Ён яму шкодны. Ён не тое, што яго не падтрымлівае – ён яго не прымае. Ну, дык навошта яму такі саюз? Але саюз павінен выжыць. Нават пры рэгістрацыі ў іншай краіне. Саюз – гэта супольнасць. Мы павінны гаварыць, раіцца і адзін аднаго падтрымліваць. Яны хай думаюць, што з гэтымі двума пакоямі мы губляем Саюз. Нельга на такое нахабства не адказаць тым, што мы ёсць.

**ВОЛЬГА, СТУДЭНТКА:**

## “ГЭТА БЫЎ АПОШНІ ВОЛЬНЫ АСТРАВОК”

Гэта быў адзін з апошніх вольных астраўкоў. Я маю на ўвазе канцэртную залу. У яе падчас імпрэзаў было не ўбіцца. Дзе мы цяпер пачуем Воюша і Хадановіча?

**ПЁТРА САДОЎСКІ, ФІЛОЛАГ, БЫЛЫ ПАСОЛ БЕЛАРУСІ Ў ФРГ:**

## “НЕ ВЕДАЮ, ШТО РОБІЦЦА Ў ГАЛАВЕ АПАНТАНАГА”

Па-першае, я не ведаю, што ў яго ў галаве робіцца. За яго адказваць цяжка. Майсей казаў: “Ведаю ўсё, але не ведаю, што робіцца ў галаве апантанага”. Калі гаварыць сур’ёзна, дык пісьменнікі – гэта выразнікі нацыянальнага духу. Наш прэзідэнт нацыянальны дух, як бы гэта сказаць, не выносіць. Ён замінае яму трымацца ля ўлады.

# З ВЯЛІКАЙ ЛІТАРЫ

*"Аляксандр Лукашэнка даручыў Міністэрству адукацыі Беларусі распрацаваць новыя правілы арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы", — паведаміла дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва БЕЛТА.*

Паводле агенцтва, "гэтае пытанне абмяркоўвалася 25 жніўня падчас даклада кіраўніку дзяржавы міністра адукацыі Аляксандра Радзькова".

Да распрацоўкі новых правілаў мае дачыненне Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук, які працаваў над новымі правіламі даўно. У інтэрвью СМІ дырэктар гэтага інстытута Аляксандр Лукашанец патлумачыў, што размова ідзе не аб рэформе, а ўсяго толькі аб "удасканаленні" мовы. У прыватнасці, размова ідзе аб новых правілах пераносу, пашырэнні ўжывання літары "ў" ды некаторых іншых момантах. Напрыклад, слова "прэзідэнт" трэба будзе пісаць з вялікай літары.

Даручэнне А.Лукашэнкі Мінадукацыі будзе выконваць аператыўна – за два тыдні – і ў абстаноўцы строгай сакрэтнасці. Звяртае на сябе ўвагу моўны рэжым працы самога міністэрства, чыноўнікі якога па-беларуску не гавораць і не пішуць, няма і беларускай версіі інтэрнэт-старонкі Мінадукацыі (www.minedu.unibel.by). Усё гэта аб'ектыўна зніжае аўтарытэт новых правілаў, якія не стануць агульнапрынятымі і будуць уводзіцца прымусова – у тым ліку, як падстава для забароны тых беларускіх СМІ і рэпрэсій супраць тых беларускіх асяродкаў, якія карыстаюцца класічным правапісам.

**Мікола Чардынец**

# У БРЭСЦЕ ЗАГІНУЎ ЛІТОЎСКІ АФІЦЭР

## СЁЛЕТА ГЭТА ТРЭЦЯЕ ЗДАРЭННЕ З ЗАМЕЖНЫМІ ДЫМЛАМАТАМІ Ў БЕЛАРУСІ – ПАСЛЯ СМЕРЦІ ПОЛЬСКАГА КОНСУЛА І ВЫСЫЛКІ САКРАТАРА ПАСОЛЬСТВА ЛАТВІІ

У мінулую суботу ў Вільні на Ерузальскіх могілках пры вялізным сходзе народу быў пахаваны літоўскі дыпламат, афіцэр бяспекі Літвы, дарадца міністра Вітаўтас Пацюнас. Ён загінуў 23 жніўня ў Брэсце, куды прыехаў на мерапрыемствы да 15-годдзя незалежнасці Украіны, якія праводзіла ўкраінскае консульства. Літоўскі дыпламат быў зарэгістраваны ў МЗС Беларусі ў якасці віцэ-консула Генеральнага консульства Літвы ў Гродне.

Абставіны гібелі Пацюнаса пакрытыя таямніцай. Паводле афіцыйнай версіі брэсцкіх праваахоўнікаў, дыпламат выпаў з 9-га паверха гатэля "Інтурыст", пры гэтым у крыві памерлага знойдзена 1,9 проміле алкаголю. Нібыта Пацюнас загуляў з украінскімі калегамі, вярнуўся ў свой нумар і там нейкім чынам вываліўся з вакна.

Тым часам, у Літве трагічнае здарэнне выклікала шок. Тут добра ведаюць 49-гадовага Пацюнаса і яго сям'ю (жонку – аўтарку папулярнай перадачы на дзяржаўным тэлеканале і чацьвярых дзяцей) – як людзей прыстойных і не даспускаюць версіі самачыннай гібелі дыпламата.

Прэм'ер-міністр Літвы Гедымінас Кіркілас зазначыў, што ў літоўскіх уладаў ёсць інфармацыя, "якая выклікае трывогу", бо ў Беларусі "былі факты збіцця дыпламатаў іншых краін, таму ўзнікае шмат падазрэнняў". З сур'ёзнымі заявамі выступілі генеральны пракурор Літвы і некаторыя палітыкі. Дэпутат Еўрапарламента, былы спікер Сейма Літвы Вітаўтас Ландсбергіс назваў здарэнне "палітычным забойствам", а Пацюнаса – "самаадданым змагаром".



**Выгляд з 9-га** *паверха гатэля "Інтурыст" – апошняе, што мог бачыць перад смерцю Вітаўтас Пацюнас. Фота Lietuvos Rytas.*

У літоўскіх СМІ з'явіліся звесткі пра тое, што ў сваім нумары Пацюнас быў не адзін, што выпаў ён не з вакна, а з гаўбца, што напой, які ён ужываў у бары гатэля, мог быць атручаны, і што на целе дыпламата літоўскія эксперты выявілі колатую рану, праўда, пакуль не могуць дакладна сказаць, што з'явілася яна не ў выніку падзення.

Да прызначэння ў Гродна В. Пацюнас узначальваў адну са службаў у Дэпартаменце дзяржаўнай бяспекі Літвы. У прыватнасці, ён займаўся расследаваннем дзейнасці адхіленага з пасады экс-прэзідэнта Літвы Раландаса Паксаса і спонсара яго перадвыбарнай кампаніі Юрыя Барысава.

Пракурор Ленінскага раёна Брэста Уладзімір Масюк паведаміў, што супрацоўнікі пракуратуры збіраюцца "апытаць" дыпламатаў, якія разам з Пацюнасам прысутнічалі на фуршэце ў консульстве Украіны. Але чыноўнікі больш высокага рангу ў Мінску пакуль захоўваюць маўчанне. Маўчыць і БТ, якое любіць выхваляцца "журналісцкімі расследаваннямі". У выніку апошняга такога "расследавання", калі латышскі дыпламат быў абвінавачаны ў распаўсюджванні парнаграфіі, а з тэлеэкрана на ўсю краіну паказалі гомасексуальны полавы акт, паміж Мінскам і Рыгай успыхнуў дыпламатычны скандал. Цяпер жа БТ не спяшаецца раскручваць скандальны сюжэт са смерцю літоўскага дыпламата.

**Алесь Шумскі**

## БЕЛАРУСЬ І СУСЕДЗІ

### Сярэдні заробак

Сёлета ў другім квартале сярэдні заробак у Літве вырас у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага году на 14,1 працэнта і склаў 584,5 USD, — паведамляе Дэпартамент статыстыкі Літвы. Пры гэтым у дзяржаўным сектары заробкі падвысіліся на 13,7 працэнта і склалі 609,6 USD, а ў прыватным – на 14,9% — 568,4 USD.

У Беларусі сярэдні заробак да канца гэтага году павінен перавысіць 300 USD – такое абяцанне тыдзень таму на паседжанні прэзідыюма ўраду даў міністр эканомікі Мікалай Зайчанка.

### Гераіню беларускай гісторыі помняць у Літве

Банк Літвы паведаміў, што 12 верасня выпусціць у зварот памятную манету вартасцю 50 літаў, прысвечаную паўстанню 1831 году і 200-м угодкам гераіні гэтага паўстання Эміліі Плятэр. Беларуская паэтка і фальклярыстка Эмілія Плятэр нарадзілася ў Вільні, а з 9-ці гадоў жыла ў маёнтку Ліксна Віцебскай губерні. Збірала і апрацоўвала беларускія народныя песні, пісала вершы. У 27 гадоў узначаліла партызанскі атрад і загінула ад расійскай кулі. Юбілейныя мерапрыемствы з нагоды юбілею Эміліі Плятэр пройдуць у Літве і Польшчы. У Беларусі на афіцыйным узроўні гэты юбілей адзначацца не будзе.

### Мама, пачытай...

Колькі, на вашу думку, за год выходзіць дзіцячых кніжак у Літве? Ні за што не адгадаеце. Летась 78 літоўскіх выдавецтваў выпусцілі 503 назвы такіх кніг. Толькі для дзяцей і толькі па-літоўску. Большасць з іх, натуральна, перакладныя – Гары Потэры, Віні Пухі ды іншыя здабыткі сусветнай літаратуры. Аднак ажно 78 – арыгінальныя, якія належаць пяру літоўскіх пісьменнікаў. Для трохмільённай нацыі, згадзіцеся, зусім не мала. Каб параўнаць літоўскую сітуацыю з беларускай, дастаткова зазірнуць у кнігарню і палічыць, колькі новых беларускіх дзіцячых кніжак выпушчана для патрэбаў дзесяцімільённай нацыі.

**Уласная інфармацыя**

# ДОМ ЛІТАРАТАРА ПЕРАТВОРАНЫ Ў КАБАК

## ЧАМУ ЛІКВІДУЕЦЦА НАЙСТАРЭЙШАЯ ТВОРЧАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСІ?

► СТАР.1



**Былы Дом** *літаратара ў Мінску на вул. Фрунзе, 5.*

ратара, як маёмасць пісьменнікаў, як іх уласнасць.

З прыходам да ўлады А.Лукашэнкі гэты будынак быў адабраны ў пісьменнікаў і перададзены ва ўласнасць адміністрацыі прэзідэнта. Юрыдычна гэта быў адкрыты крадзёж з боку надзеленай абсалютнай уладай персоны. Выпадак – беспрэцэдэнтны на постсавецкай прасторы. Яшчэ нідзе ў літаратараў іхнія Дамы не адбіралі. Навошта ж пазарыўся на пісьменніцкую маёмасць Лукашэнка?

### НЕ МАЙ КУМІРА, АКРАМЯ... КУМІРА

Адказ на гэтае пытанне – філасофскі. Згадаю швейцарскага псіхааналітыка Карла Густава Юнга, які, разважаючы пра любімую жанчыну Гітлера, пісаў, што паколькі ў фюрэра такой жынчынай была толькі Германія, дык і ў Германіі мусіў быць толькі ён, фюрэр. Цяпер успомнім Лукашэнкава выказванне пра тое, што менавіта гітлераўскую Германію ён разглядае як узор прэзідэнцкай рэспублікі для Беларусі, і ўсё стане зразумела.

У яго ёсць толькі Беларусь – яго плацдарм, “кусок землі”, як ён сам яе называе. Значыць, і ў Беларусі павінен быць толькі ён. Ніякіх народных пісьменнікаў, ніякіх іншых герояў. Нават даўно мёртвы Машэраў быў адсунуты ім з цэнтральнага праспекта, нават Скарына... Народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў быў вымушаны з’ехаць за мяжу. Народны пісьменнік Янка Брыль не атрымаў належнае ўвагі дзяржавы ні пры жыцці, ні пасля смерці.

Лукашэнка разумее, што яго адзінапрысутнасць у розумах беларусаў – гэта зарука яго сілы, бо калі ты адзіны, усе твае хібы і недахопы ператвараюцца ў вартасці і прыўкрасы – няма з кім параўноўваць.

Чаму Машэраў не ваяваў з літаратарамі, а наадварот – спрыяў іх аўтарытэту ў грамадстве? Таму што ён не быў ні адзіным, ні рэальна пяршым – першы і адзіны сядзеў у Маскве.

**У яго ёсць толькі Беларусь – яго плацдарм, “кусок землі”, як ён сам яе называе. Значыць, і ў Беларусі павінен быць толькі ён. Ніякіх народных пісьменнікаў, ніякіх іншых герояў. Нават даўно мёртвы Машэраў быў адсунуты ім з цэнтральнага праспекта, нават Скарына...**

Лукашэнка актыўна тусуе карты сваіх чыноўнікаў – каб ніхто асабліва не прымільгаўся, не загаварыў якой адсябяціны. Што ўжо казаць пра літаратараў, якім паводле прафесіі належыць гаварыць тое, што думаюць. Гэць іх усіх з тэлебачання, з радыё, з газет, часопісаў і выдавецтваў.

З гледзішча асабістага інтарэсу Лукашэнкі да ўлады ён усё робіць правільна. І справа зусім не ў нейкіх “апазіцыйных поглядах” беларускіх пісьменнікаў ці ў чым іншым. Справа менавіта ў прыдушэнні ўсіх канкурэнтаў на ўладу. Літаратар у Беларусі, як вядома, і ёсць – уладар народных дум.

А вось з гледзішча нацыянальных інтарэсаў тут – яўны правал. І ў плане аўтарытэту на міжнароднай арэне (у РБ сёння – ніякага аўтарытэту няма), і ў плане культуры нацыі. Варта згадаць толькі публічную мацяршчыну беларускіх міліцыянтаў – чаго да Лукашэнкі немагчыма было сабе нават уявіць. Адбываецца люмпенізацыя бытавой культуры беларусаў. Пра высокае ў нас не гавораць. У нас цяпер нізка гавораць ні пра што.

Вось, бадай, і ўвесь сэнс адабрання Дома літаратара. Наколькі ён рацыянальны – мяркуйце самі. Застаецца толькі сказаць пра тыя “дзяржаўныя справы”, якія будуць цяпер рабіцца ў адміністрацыйным будынку на Фрунзэ, 5.

### НАЙЛЕПШАЕ КІНО – ГЭТА ВІНО

Адразу пасля таго, як будынак быў гвалтам “прыватызаваны” А.Лукашэнкам, пісьменнікаў сціснулі ў плошчы да двух пакояў і бібліятэкі. Так яны і суіснавалі некалькі гадоў. У астатнім будынку – ішлі банкеты. З часам былы Дом літаратара ператварыўся ў суцэльную банкетную залу, дзе раздабрэлае на прэзідэнцкім кармленні чынавенства “жрёт водку”, а віскі дам перамежваюцца нязлой мацяршчынай “государевых людей”. Банкеты ідуць незалежна ад таго, ці дзень рабочы, ці жалобны. Не раз, выйшаўшы з паэтычнай вечарыны, дзе гучалі сапраўдныя шэдэўры аўтараў новага пакалення, мне даводзілася лоб у лоб сутыкацца з гэтай захмялелай камарылляй, якая ўсім выглядам давала зразумець, што гаспадарыць цяпер тут – яна.

Але вось ужо і бібліятэку – унікальную калекцыю кніг – вывезлі ў невядомым накірунку. Нарэшце прыйшоў час мемарыяльнага пакоя народнага паэта Максіма Танка. У бібліятэцы і ў пакоі Танка будуць абсталяваныя новыя банкетныя залы.

**Сяргей Паўлоўскі,**
s.paulouski@tut.by

# ЦІ МОЖНА НАВУЧЫЦЬ АСЛА ГАВАРЫЦЬ?

## УРАД АБЯЦАЕ БЕЛАРУСАМ, ШТО КВАДРАТНЫ МЕТР ЖЫЛЛЯ БУДЗЕ КАШТАВАЦЬ НЕ БОЛЬШ ЗА СЯРЭДНІ ЗАРОБАК

Калісьці за савецкім часам камуністы гарантавалі, што ў 2000 годзе кожная савецкая сям'я будзе мець асобную кватэру. Цяпер абяцанкі значна больш сціплыя, але ўсё роўна выконваць іх ніхто не збіраецца.

Днямі першы віцэ-прэм'ер РБ Уладзімір Сямашка заявіў, што ў 2010 годзе (сачыце за рукамі) адзін квадратны метр жылля будзе каштаваць не больш за сярэднямесячны заробак па краіне. Фокус!

Бо сёння, прыкладам, сярэдняму менчуку трэба працаваць ажно чатыры месяцы, каб набыць гэты метр. Каштуе ён каля 1200 даляраў, а сярэдні заробак па Мінску, паводле афіцыйнай статыстыкі, складае крыху больш за 300 "зялёных".

Канечне, нядрэнна было б атрымліваць тысячу даляраў у месяц – якраз на адзін квадратны метр. Аднак такога шчасця нам не абяцаюць нават цяперашнія правадыры. Згодна з іх планамі, у 2010 годзе сярэдні заробак у Беларусі будзе складаць каля 500 даляраў.

Такім чынам, атрымліваецца, што кошты на жыллё мусяць да таго часу абрынуцца ўніз у два разы з гакам. Вы верыце ў гэта? Я вам зайздрошчу.

Нават наіўны чалавек разумее, што ў гэтай урадавай матэматыцы нешта адно з адным не стасуецца. Выходзіць, што ў бліжэйшыя гады заробкі будуць павялічвацца, а цэны на кватэры – падаць. У чым сакрэт?

Сакрэт вельмі просты. Гэты прыём у свой час актыўна выкарыстоўваў усходні хітраван Хаджа Насраддзін. Ён паабяцаў шаху, што за 20 гадоў здолее навучыць ішака гаварыць. Хаджа пралічыў, што за гэты час памрэ альбо ішак, альбо шах, альбо ён сам.

Аднак перанос гэтай тактыкі на жыллёвае пытанне – кепская прыкмета для ўладаў. Ім лепш распавядаць пра светлую будучыню ў менш канкрэтных катэгорыях. У свой час Хрушчоў паабяцаў пабудаваць у СССР камунізм да 1980 году. Не атрымалася, ну і хай сабе: Палітбюро замяніла камунізм на маскоўскую Алімпіяду, і кіравала сабе далей. Аднак толькі Гарбачоў гарантаваў кватэру кожнай савецкай сям'і да 2000 году, і неўзабаве Саюз пачаў развальвацца. Ішак здох яшчэ на пачатку 1990-х гадоў. Магчыма, і заява Сямашкі – гэта прадвеснік хуткага скону цяперашняга рэжыму?

**Калісьці за савецкім часам камуністы гарантавалі, што ў 2000 годзе кожная савецкая сям'я будзе мець асобную кватэру. Цяпер абяцанкі значна больш сціплыя, але ўсё роўна выконваць іх ніхто не збіраецца.**



Адна паралель паміж гэтымі гісторыямі дакладна існуе. Гарбачоў быў досыць разумны, каб ад самага пачатку ведаць, што з кватэрамі нічога не атрымаецца. Але жыллёвае пытанне ў СССР было настолькі вострым, што генсек вырашыў павесіць моркву перад носам савецкага народу: працуйце, працуйце і яшчэ раз працуйце, і будзе вам шчасце. Праз 15 гадоў.

Так і Лукашэнка кожны год абураецца коштамі на кватэры і публічна патрабуе ад сваіх міністраў зрабіць жыллё даступным. Гэтая казка пра белага бычка доўжыцца яшчэ з мінулага стагоддзя без усякіх вынікаў. Паводле прызнання кіраўніка дзяржавы, нават ён не ў стане набыць сабе сціплую двухпакаёўку. Мусіць, таму і ў адстаўку не сыходзіць, каб не выязджаць са службовай рэзідэнцыі ў чыстае поле. Хаця заробак у Лукашэнкі далёка не сярэдні.

Ёсць, праўда, яшчэ адна магчымасць набыць дах над галавой. У мінулым годзе Лукашэнка пераўзышоў нават Гарбачова, заявіўшы, што кожная сям'я, у якой нарадзіцца трэцяе дзіця, атрымае ад дзяржавы БЯСПЛАТНУЮ кватэру. Трое дзяцей – гэта цалкам рэальна, але ніхто з тых, хто мае двух, не спяшаўся ў раддом. І слушна: хутка была ўнесена "папраўчка". Цяпер ужо меркавалася, што бясплатнае жыллё будуць даваць не за трэцяе, а за пятае дзіця.

Пяцёра малых – гэта ўжо варыянт, уласцівы хутчэй для Кітая, чым для Беларусі. Аднак дагэтуль нават наяўнасць такой колькасці дзяцей нічога не гарантуе. Бо свае намеры на паперы нашы кіраўнікі не паклалі.

Цяпер яны расказваюць казкі пра 2010 год (глядзі вышэй). Але калі да таго часу Сямашку не звольняць, а народ не забудзецца пра яго ныя абяцанкі, знойдзецца тысяча прычынаў, чаму абяцанкі не выкананыя. Прыпляцуць і амерыканскі імперыялізм, і расійскіх алігархаў, і чорта лысага. Аднаго толькі не будзе – танных кватэраў.

Бо пакуль чыноўнікі расказваюць казкі, кошты паціху растуць. За жнівень яны ўзняліся на паўтары адсоткі, у верасні чакаецца, што падвысяцца яшчэ на паўтары...

**Васіль Філін**

# ЯШЧЭ АДНА ЛІНІЯ СТАЛІНА




Тэма інтэграцыі з Расіяй ужо другі дзясятак гадоў з'яўляецца галоўнай тэмай усіх афіцыйных газет. Чытаць гэтую сагу без канца, як правіла, нецікава з-за бясконцага паўтарэння таго самага. Але гэта — калі пішуць мінскія "інтэграсты". Іншая справа, калі слова даецца супрацьлегламу боку. У чацвер "Народная газета" апублікавала ітэрвью з дэпутатам расійскай Дзярждумы Аляксандрам Хінштэйнам, які пасля дзяжурных рэверансаў у бок адданых Расіі беларусаў сказаў наступнае:

*"Думаю, исторически вопрос стоит так: все равно Россия будет расширяться и граница будет восстановлена, а она является стратегической зоной ответственности. Так что Россия сегодня в ответе за Беларусь. А учитывая то, как дружелюбно белорусы настроены (я часто бываю в Минске в командировках и вижу это), жить и работать нам единой семьей, мы все равно придем к этому. Так что я сомневаюсь, что, учреждая Союзное государство, Россия сажает себе на шею нахлебника".*

Пагадзіцеся, крыўдаваць не выпадае. Бо як можна крыўдаваць на шчырыя словы пра аднаўленую расійскую мяжу? Хочацца, каб афіцыйныя мінскія газеты часцей давалі слова маскоўскім калегам. Каб яны шчыра распавялі і пра аднаўленую валюту, і пра аднаўленае грамадзянства, і, самае галоўнае, пра аднаўленае войска. Глядзіш, наступным візітам беларусы ўжо не пададуцца пану Хінштэйну такімі дружалюбнымі.

А публіцыст "Советской Белоруссии» Барыс Ляпешка ў пятнічным нумары задаўся філасофскай праблемай: Чаму ў нас не з'яўляецца каштоўнасцю індывідуалізм?

*"Почему так получилось? Ответ слишком сложен, но главное все же можно выделить. Во–первых, наши вековые достоинства, в частности, коллективная ментальность, соборность, как духовная, так и бытовая, в этом аспекте стали нашими недостатками. То есть индивидуальное все время подавлялось, коллективное подавалось и как образ жизни, и как социальный идеал. Во-вторых, часто употребляется понятие «варварство». Мы были варварами много веков, а многие наши «друзья» считают и ныне, что варварами мы и остались. Очевидно, что здесь есть своя правда, но правда не вся. В-третьих, сами славянские просторы, наша географическая беспредельность формировали коллективный способ освоения мира и такой же тип мышления".*

Якімі толькі эпітэтамі не ўзнагароджваліся беларусы ў афіцыйным друку. І забітымі былі, і непісьменнымі былі. Зараз вось варварамі сталі на славянскіх прасторах. Цікава, ці ведае аўтар, што гэтыя прасторы былі на працягу стагоддзяў не нашмат большыя за сённяшнія межы РБ? Што ж тычыцца індывідуалізму, дык варта раскрыць любую старонку Статута ВКЛ, каб пераканацца, што гэтая каштоўнасць была ўласцівая продкам сённяшніх беларусаў спрадвеку. Пакуль іх не далучылі да "славянскіх прастораў" Каўказа і Сібіры.

Радасную навіну паведаміла днямі газета "Рэспубліка" ў рубрыцы "Новость на первую" – "Еще одна "Линия Сталина".

*"Недалеко от деревни Гомель под Полоцком сейчас активно идут работы по восстановлению части Полоцкого укрепрайона, входящего накануне войны в состав так называемой Линии Сталина. Первую очередь нового историко-культурного комплекса планируется ввести в строй 15 сентября этого года".*

Уявіце сабе даўжыню той старой польска-савецкай мяжы. І памножце гэту даўжыню на энтузіязм правінцыйнага чынавенства. І паспрабуйце вылічыць, праз колькі гадоў у "гісторыка-культурную" каштоўнасць з абавязковымі помнікамі правадыру ператворыцца ўся краіна. І якія каштоўнасці з дзяржаўнай кішэні яшчэ перакачуюць у кішэні круцялёў ад ідэалогіі. А ўрэшце – колькі спатрэбіцца пасля сродкаў, каб узнавіць праўду гісторыі, у якой месца для "лініяў Сталіна" папросту няма. Бо нават школьнік ведае, што немцы ў 1941-м прайшлі ўсю Беларусь за чатыры дні – без адзінага бою. Толькі напачатку – у Брэсце – ім аказаў супраціў тамтэйшы гарнізон.

А "на салодкае" прывяду цытату з "Літаратуры і мастацтва". Дзе дырэктар інфармацыйна-турыстычнага цэнтра "Мінск" Мінгарвыканкама Віталь Машэчкоў распавядае, як зрабіць беларускую сталіцу турыстычнай меккай. Вось, што чакае Лошыцкі ансамбль:

*"Лошыцкі парк будзе існаваць як "гістарычная" турыстычная зона, сядзібна-паркавы комплекс. Там будзе пабудавана гасцініца. Гістарычныя будынкі на тэрыторыі парку, у якіх яшчэ жывуць людзі, — млын, стары спіртзавод – будуць ліквідаваныя, а людзі адселеныя".*

І расстраляныя — хочацца дадаць да гэтых слоў. Бо Лошыца, як вядома, за сталінскім часам была адным з месцаў масавых расстрэлаў. Можа, яна стане лагічным працягам турыстычнай "Лініі Сталіна"?

Цікава, што гэта за загадкавыя людзі жывуць у тым паўразбураным млыне? Я разумею, што мова мінскіх чыноўнікаў слаба паддаецца перакладу. Напэўна, чыноўнік хацеў сказаць, што будуць ліквідаваныя якіясь недахопы ў рэстаўрацыі? Бо ў іншым выпадку нам засталося нядоўга цешыцца рамантычнымі руінамі, і трэба як мага хутчэй весці ў Лошыцу замежных турыстаў. Каб яны на свае вочы ўбачылі гэтую дзею. Такога дзікунскага аракцыёна яны не знойдуць нідзе. Нават у Афрыцы.

**Алесь Канючыц**

## ПРОСТАЯ МОВА

# НІЗ УЗЯЎ ВЕРХ

## «ЭТО ВАМ НЕ ИНСТИТУТ БЛАГОРОДНЫХ ДЕВИЦ!»

І падумаць толькі – былі часы, калі было непрыстойным для кабеты паказваць нагу вышэй костачкі. А ў добра выхаваным таварыстве нельга было нават казаць «яйкі – трэ было «плады курыцы».

Сёння – можна ўсё. І ўсім. Ужо ніхто не ўжывае ў друку шматкроп'е, як раней друкавалі – «ср...ка». Наадварот – ніякі тэкст не лічыцца сучасным і прагрэсіўным, калі ў ім няма хоць бы слова «засранец».

«Я ванітаваў усю ноч» — так цяпер пачынаюць літаратурны твор. Гэта вам не «Усё змяшалася ў доме Аблонскіх».

Вы будзеце смяяцца, але быў звычай не лаяцца матам пры жанчынах! Думаю, неўзабаве ён вернецца: мужыкам стане сорамна за недасканаласць сваіх мацюкоў у параўнанні з дамскім матам. Матрыярхат наступае!

А то вось заўважыў нейк на прыпынку дзяўчыну-красуню – вочы з доўгімі вейкамі, пушыстыя валасы да таліі, белая спаднічка з фальбанкамі – Бацічэлі б расчуліўся! Ды вось падыйшла да яе сяброўка, анёлак мой разявіў роцік, і...

«... тваю маць!» — вылаяўся я ў думках, і пайшоў, гаротны і расчараваны.

Былі нядаўна ў Вільні гастролі Вольнага тэатра з Мінска. П'есы былі пра «соль зямлі» ва ўяўленні сучасных драматургаў – прастытутак і наркаманаў. Лексіка і паводзіны – адпаведныя.

А ў зале, на пярэднім радзе сядзела самая сапраўдная бамжыха. Галава, што сумуе па шампуню, брудны расцягнуты швэдар і палатняная торба цераз плячо – відаць, з усімі ейнымі трантамі. А мо там і чабурэк быў недаедзены, мяркуючы па тлустых плямах.

І толькі потым я даведаўся – гэта ж вядомая тэатральная крытыкеса, загадчыцца літаратурнай часткі таго ж тэатра.

А вось нядаўна ў Варшаве наведаў выставу сучаснага мастацтва. Тэма – летняе каханне. О, як ува мне ўстрапянуўся Ўнутраны Рамантык!

Як на ўсіх сучасных выставах, у зале – вялікі манітор. А там паказваецца акцыя: у вялікім памяшканні з дзясятак галюсенькіх параў займаюцца капуляцыяй. «Траханнем», калі хто не зразумеў. Калі ў кагосьці атрымалася – чутны воплескі публікі, што стаяла там жа, побач. Адзін самец хацеў быць «круцейшым» за астатніх і «апрацаваць» даму, якая ашчаперыла яго спераду на «стаяка». Але ў яго не надта выходзіла, і ён увесь час папраўляў свой «орган» рукой. І апладысментаў не атрымаў.

Здалёку гэта нагадвала капашэнне тлустых белых глістоў у вясковай прыбіральні.

О, рамантыка летняга кахання!

«Гэта ўсё з мярзотнага Захаду!» — крычаць «славянскія патрыёты» з «трэцяга Рыму».

Не, браточкі. Гэта ўсё – рэха той вашай «Великой Октябрьской». Гэта ваша ВОСР зрабіла «ўсім, хто быў нікім». Гэта ўсё і ёсць эстэтыка гэтых «ніхто», дна, «падонкаў» — у мове, у паводзінах, у вопратцы.

«Это вам не институт благородных девиц!» — гэта што, з Захаду прыйшла такая прыказка?

А якія, вы думалі, іншыя кветачкі вырастуць на зруйнаваных і апаганеных «дворянских гнёздах»? Гэта ваша радзіма, як пісаў адзін паэт «весь аромат Серебряного века» прамяняла на «вонь портянок». І ўвесь свет прасмярдзеўся.

Доўга ж цяпер давядзецца ветрыць...

**Алег Аблажэй**

## ДНІ

**31 жніўня** 1989 году малдаўская мова была абвешчана ў Малдове дзяржаўнай і пераведзена на лацінскі шрыфт. Праз год, у 1990-м, падобны закон будзе прыняты і ў Беларусі. Ён прадугледжваў, што за дзесяць гадоў усе ўстановы загавораць пабеларуску. Але на палове тэрміну, у 1995-м, гэты закон быў адменены па выніках рэферэндума.

**1 верасня** 1906 году ў Вільні выйшла першая легальная беларуская газета «Наша доля». Праіснавала яна нядоўга – выйшла ўсяго 7 нумароў, якія канфіскоўвала паліцыя. Урэшце калектыў рэдакцыі прыступіў да выдання газеты больш памяркоўнага кірунку, якая называлася «Наша Ніва».

**2 верасня** 1998 году ў Віцебску быў арыштаваны апазіцыянер Уладзімір Плешчанка. Яму інкрымінавалі крадзёж вулічнага бюста Аляксандра Суворава, расійскага палкаводца, які ў беларускую гісторыю ўвайшоў як душыцель паўстання за незалежнасць 1794 году. Помнік Сувораву быў пастаўлены ў Віцебску яшчэ пры жыцці Сталіна. Праз дзень прапажу знайшлі, але Плешчанку пратрымалі за кратамі каля году.

**3 верасня** ў 1932 годзе загінуў легендарны савецкі піянер Паўлік Марозаў. Справа адбывалася глыбока ў Сібіры. Але цікава, што сям'я Марозавых паходзіць з Беларусі. Бацька Паўліка не любіў савецкую ўладу і хаваў ад яе хлеб. Паўлік данёс на бацьку ў карныя органы, за што сяляне яго і забілі.

**4 верасня** ў 1936 годзе нарадзіўся беларускі пісьменнік Сакрат Яновіч. Ён прыйшоў на свет у мястэчку Крынкі ў цяперашняй Польшчы, дзе жыве і сёння. Захавалася паданне пра тое, што малы Яновіч быў у маці першынцам і ўлюбёнцам. Жадаючы яму лепшае долі ды вялікага розуму, яна й дала яму княжнае імя Сакрат.

Дзень **5 верасня** 1918 году стаў днём пачатку ў Расіі чырвонага тэрору. Пасля забойства Урыцкага і замаху на Леніна Саўнаркам прыняў пастанову аб чырвоным тэроры, з чаго і пачаліся масавыя рэпрэсіі.

## ФОТАФАКТ



**Мінск, плошча Бангалор,** *25 жніўня 2006 году.*

***Бел-чырвона-белыя сцягі*** *на рок-канцэрце з нагоды 15-й гадавіны абвяшчэння незалежнасці Беларусі.* На самым пачатку вядучы папрасіў моладзь схаваць нацыянальныя сцягі, бо інакш канцэрт адменяць. Арганізатараў можна зразумець. Сярод музыкаў на сцэне былі папулярныя гурты "НРМ", "Крама", "Нейра-дзюбель".За мінулы такі канцэрт на "апазіцыйнай плошчы" Бангалор прыкладна год таму яны ўжо заплацілі тым, што былі занесеныя ў "чорныя спісы": іх не пускаюць у эфір, не дазваляюць гастраляваць без ліцэнзіі.

Гледачы зрабілі па-рознаму. Нехта схаваў сцяг у заплечнік, нехта расьцягнуў над сабой, каб схавацца ад дажджу, нехта паклаў на плечы сабе і таварышам. Усё як заўсёды ў жыцці. Заўжды ёсць выбар – безумоўна падпарадкавацца, зрабіць выгляд, што падпаракоўваешся, альбо зрабіць па-свойму, як ты лічыш правільным.

Падобны выбар ёсць сёння і ў беларускіх пісьменнікаў, і ўвогуле ва ўсіх нармальных людзей.

# «ЛЮДЗІ! БЕРАЖЫЦЕ БАЛОТА! ЯНО НАМ ЯШЧЭ СПАТРЭБІЦЦА...»




belzhaba.com

ЯК ТОЛЬКІ З’ЯВІЛІСЯ ПЕРШАДРУКАРЫ – З’ЯВІЛІСЯ І ЦЭНЗАРЫ. БЫЛО ВЫНАЙДЗЕНА РАДЫЁ – З’ЯВІЛІСЯ “ГЛУШЫЛКІ”. 15 ГАДОЎ ТАМУ НАРАДЗІЎСЯ ІНТЭРНЭТ. І АДРАЗУ КАМУНІСТЫЧНАЯ ЎЛАДА ПАЧАЛА ШУКАЦЬ УПРАВУ НА ЯГО. ПІШУЦЬ, ШТО ЎРАД РБ НЯДАЎНА ЗАКУПІЎ У КІТАІ “МАШЫНЫ ДЛЯ АЎТАМАТЫЧНАЙ АПРАЦОЎКІ” (АЖНО НА 20 МІЛЬЁНАЎ ДАЛЯРАЎ), КАБ КАНТРАЛЯВАЦЬ СЕЦІВА І НЕ ДАПУСКАЦЬ З’ЯЎЛЕННЯ Ў ІМ СЛОВАЎ КШТАЛТУ “СВАБОДА”.

АЛЕ ЎСЕ ГЭТЫЯ ВЫНАХОДНІКІ ЗАБЫВАЮЦЬ, ШТО СВАБОДА ІСНУЕ НЕ Ў ТЭКСТАХ І НЕ Ў ТЭХНІЧНЫХ ПРЫЛАДАХ, А Ў НАШЫХ З ВАМІ ГАЛОВАХ. ЧЫМ БОЛЬШ ЛЮДЗЕЙ БУДЗЕ ДУМАЦЬ І АДЧУВАЦЬ СЯБЕ ВОЛЬНЫМІ, ТЫМ МЕНЕЙ ШАНЦАЎ У НАЧАЛЬСТВА НЕШТА ЗАБАРАНІЦЬ.

АБ ГЭТЫМ СВЕДЧЫЦЬ І ДОСВЕД ГАЗЕТЫ “СВАБОДА”, ЯКАЯ АДРАДЗІЛАСЯ Ў ВОЛЬНЫМ ДРУКУ.

ЦЯПЕР НАС МОЖНА ТАКСАМА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ НА АДРАСЕ

# WWW.VILNIA.COM

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by) **Тыраж** 299 экзэмпляраў